# Збытавікі рвуцца «ў бой»

## У Гродне рэалізаваны важны інвестыцыйны праект

**Адным з прыярытэтаў эканамічнага развіцця Гродзеншчыны з'яўляецца мадэрнізацыя прадпрыемстваў, якія перапрацоўваюць сельскагаспадарчую прадукцыю. У прыватнасці, сур'ёзна рэканструяваны Ваўкавыскі мясакамбінат, шмат робіцца па ўкараненні новых тэхналогій на Слонімскім мясакамбінаце.**



Кіраўнік ААТ «Гроднапрамбуд» Абдулвагаб Вагабаў *(злева)* уручыў генеральнаму дарэктару Гродзенскага мясакамбіната Анатолю Грышку сімвалічны ключ ад новага цэха.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

— Пры гэтым вельмі важна, што ствараюцца новыя рабочыя месцы. Улада і надалей будзе падтрымліваць такія праекты, — зазначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ** падчас адкрыцця новага цэха па вытворчасці сыравэнджаных вырабаў у ААТ «Гродзенскі мясакамбінат».

У гэты праект інвеставана каля 30 мільёнаў еўра, у тым ліку 50 мільярдаў рублёў — з абласнога інавацыйнага фонду. Дзякуючы плённаму супрацоўніцтву мясаперапрацоўшчыкаў з аўтарамі тэхналагічнага праекта (польская фірма Promar) і спецыялістамі «Гроднапрамбуда» цэх распачаў працу на паўгода раней, чым спачатку планавалі.

З уводам цэха магутнасці прадпрыемства па гатовай прадукцыі павялічыліся на 500 тон у месяц, дадаткова арганізавана 220 рабочых месцаў. Пры гэтым умацавалі свой экспартны патэнцыял, разлічаны не толькі на рынкі Расійскай Федэрацыі.

— Нашы збытавікі ўжо рвуцца «ў бой», — кажа **генеральны дырэктар Гродзенскага мясакамбіната Анатоль ГРЫШУК**.

Новы цэх пабудавалі па самых сучасных тэхналогіях вытворчасці сыравэнджаных вырабаў. Ён працуе ў аўтаномным рэжыме па замкнутым тэхналагічным цыкле — ад паступлення сыравіны і дапаможных матэрыялаў да ўпакоўкі і адгрузкі гатовай прадукцыі. Прадугледжаны асобнае энерга- і холадазабеспячэнне, поўны комплекс бытавых і санітарна-гігіенічных памяшканняў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# НАСТАЛЬГІЯ ПА ХАТНЯЙ КАЎБАСЦЫ...



## У сезон нарыхтовак кааператары пачалі выкарыстоўваць гнуткую стратэгію закупачных цэн

**Цяпер усе вёскі, у якіх адсутнічае стацыянарная гандлёвая сетка, абслугоўваюцца аўтакрамамі спажыўкааперацыі тры разы на тыдзень, паведаміў <u>старшыня праўлення Белкаапсаюза Валерый ІВАНОЎ</u> на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню кааперацыі, які адзначаецца ў першую суботу ліпеня. Толькі летась кааператарамі было набыта 140 новых аўтакрам.**

### КАНКУРЭНЦЫЯ ПРЫМУСІЦЬ РАЗВІВАЦЬ ІНТЭРНЭТ-ГАНДАЛЬ

Сёння айчынным кааператарам даводзіцца канкурыраваць з усімі гандлёвымі арганізацыямі і буйнымі сеткамі, якія за апошнія гады атрымалі прыкметнае развіццё. «Цяпер гэта не толькі гандаль, але і грамадскае харчаванне, аказанне паслуг», — адзначыў кіраўнік ведамства. Таму саюз адкрывае новыя гандлёвыя пункты, актывізуе працу па вынасным і выязным гандлі. Цяпер спажыўкааперацыя ўдзяляе ўвагу гандлі ў месцах адпачынку, на пляжах не толькі ў раённых цэнтрах, але і ў Мінску. Усе забаўляльныя мерапрыемствы, якія праходзяць у раённых і абласных цэнтрах, таксама абслугоўваюцца сістэмай.

Валерый Іваноў прызнаўся, што канкураваць сёння няпроста. Сутнасць канкурэнцыі заключаецца ў прапанаваным лепшых умоў, прымальных цэн і дастатковага асартыменту. Менавіта невялікія цэны і якасць прадукцыі стануць тымі галоўнымі козырамі сістэмы, якія Белкаапсаюз плануе выкарыстоўваць у буйных гарадах у якасці сучасных метадаў барацьбы за пакупніка.

Кіраўнік паведаміў, што, акрамя развіцця сеткі стацыянарных гандлёвых аб'ектаў, Белкаапсаюз збіраецца актыўна асвойваць новыя для ведамства напрамкі — прапаноўваць паслугі заказу тавараў праз інтэрнэт і дастаўкі іх спажыўцу на дом.

### ПА БАБУЛІНЫХ РЭЦЭПТАХ

Адразу на трацціну павялічаны выпуск прадукцыі па так званых «хатніх» рэцэптах. Асноўны акцэнт у перапрацоўцы садавіны і гародніны зроблены на выпуск кансерваванай прадукцыі з максімальным захаваннем першапачатковых якасцяў перапрацаванай сыравіны традыцыйнымі метадамі квашання, мачэння і салення.

Мадэрнізацыя ў гэтым спектры вялася такім чынам, каб не толькі павялічыць аб'ёмы, але і захаваць нацыянальны каларыт нашых прадуктаў. Толькі летась выраблена прадуктаў з мяса па нацыянальных рэцэптах 11,8 тысячы тон, што ў 1,5 раза больш за ўзровень 2009 года. З мэтай павелічэння аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі квашання, салення і мачэння праведзена работа па мадэрнізацыі і ўзбуйненні квасільна-засолачных цэхаў.

Сфарміраваная ў насельніцтва ўстойлівая думка аб натуральнасці і экалагічнасці прадукцыі, што выпускаецца кааператарамі, абавязвае гэтую галіну да павелічэння аб'ёмаў вытворчасці традыцыйнымі метадамі, асабліва ў хлебапячэнні, мясаперапрацоўцы, перапрацоўцы плодаагароднінай і дзікарослай сыравіны, упэўнены Валерый Іваноў.

### ЗАТАВАРЫЦЦА НАПОЎНІЦУ

Цяпер спажывецкая кааперацыя забяспечвае штогадовы рост закупак у насельніцтва лішкаў сельскагаспадарчай і дзікарослай прадукцыі. «Наша асноўная мэта — закупіць усю прадукцыю, якую нам гатовы прадаць, перапрацаваць яе і рэалізаваць», — адзначыў Валерый Іваноў. Ён канстатаваў, што летась за здаленую прадукцыю насельніцтва атрымала 1,4 трлн рублёў. Пры гэтым былі закуплены рэкордныя аб'ёмы па такіх відах прадукцыі, як агуркі і морква.

«Для максімальнага асваення лішкаў прымаюцца меры па своечасовым інфармаванні насельніцтва аб патрабаваннях да якасці прадукцыі, закупачных цэнах і месцах размяшчэння прыёмных пунктаў», — паведаміў старшыня Белкаапсаюза. Сёння ў людзей закупляецца больш за 30 відаў сельгаспрадукцыі і сыравіны. Сёлета ўжо пачаўся масавы сезон нарыхтовак. Асноўны ўпор будзе зроблены на максімальны ахоп нарыхтоўшчыкамі не толькі населеных пунктаў, але і месцаў масавага збору і рэалізацыі сельскагаспадарчай і дзікарослай прадукцыі, а таксама на выкарыстанне гнуткай стратэгіі пры фарміраванні закупачных коштаў.

### РАЗВІВАЦЬ СВАЁ

У сістэме спажыўкааперацыі працуюць сёння больш за 9 тысяч аб'ектаў рознічнай гандлёвай сеткі. Доля айчынных тавараў у крамах Белкаапсаюза складае 93%. Толькі летась у сістэме спажыўкааперацыі было адкрыта 26 крам гандлёвай плошчай 500 кв.м і больш, уведзена ў эксплуатацыю 78 магазінаў крокавай даступнасці і 37 спецыялізаваных крам нехарчовых тавараў. Валерый Іваноў упэўнены, што Белкаапсаюз робіць усё магчымае не толькі для забеспячэння насельніцтва гарадоў і вёсак шырокім асартыментам тавараў і паслуг, але і прадастаўляе працоўныя месцы жыхарам нашай краіны, а таксама паляпшае ўзровень нашага жыцця.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Вадкі рынак

# У БАРАЦЬБЕ З ЛЕТНЯЙ СМАГАЙ

## Беларусы аддаюць перавагу газіроўцы і квасу

**Лета нарэшце паказала свой характар. Сіноптыкі прагназуюць спякоту і надалей. Для прадпрыемстваў па вытворчасці шматлікіх напояў лета — самы лепшы час для нарошчвання аб'ёмаў.**

У гэты перыяд аб'ём вытворчасці піва заводам «Крыніца» ўзрасце на 60% у параўнанні з зімой (гэта ў сярэднім 4,4 мільёна літраў). Светлыя гатункі піва летам самыя папулярныя. Квасу прадпрыемства выраблае ў 11 разоў больш, чым у іншыя перыяды, у сярэднім гэта 1,5 мільёна літраў.

На Мінскім заводзе безалкагольных напояў аб'ём вытворчасці павялічваецца ў 1,5-2 раза. Усяго летам у Беларусі плануюць распаўсюдзіць 15 млн літраў, з якіх палова будзе прададзена ў Мінску. На першым месцы па папулярнасці — мінеральная вада «Мінская», пасля якой спажыўцы аддаюць перавагу «Бела-коле», а таксама халоднаму чорнаму і зялёнаму чаю. Выпрацоўваць прадукцыю будуць, зыходзячы з патрэб насельніцтва.

Аб'ём вытворчасці на піўзаводзе «Аліварыя» падчас «высокага сезона» (з мая па верасень), павялічваецца ў 1,5 раза, гэта больш за палову ўсёй прадукцыі, што выпускаецца за год. Напрыклад, у 2014 годзе «Аліварыя» выпусціла амаль 50 млн літраў піва, а гэта 31,3% піўнога рынку Беларусі. Сёлета прадпрыемства плануе паўтарыць гэты вынік. Безалкагольныя напоі кампанія не выраблае.

У параўнанні з вясновымі месяцамі аб'ём выраблений на прадпрыемстве «Дарыда» прадукцыі ў летні перыяд павялічваецца амаль на 40%, а ў параўнанні з зімнімі — у 2 разы. За 1 летні месяц выраблаецца 14-15 млн бутэлек мінеральнай і пітной вады і напояў. Перш за ўсё, у гарачыя дні запатрабаваная мінеральная і звычайная пітная вада, лінія вады з розным смакам. Доля сталіцы ў аб'ёме рэалізацыі складае 30-35%.

На прадпрыемстве «Лідскае піва» летам вытворчасць павялічваецца ў два разы, у параўнанні з іншымі перыядамі. Напрыклад, у маі было выраблена 2 млн літраў піва і напояў у параўнанні з 1 млн літраў у студзені. Летам спажыўцам падабаецца светлае піва. Найбольш запатрабаваны летні напой — гэта зноўтакі квас, менавіта для гэтай катэгорыі выразна прасочваецца сезоннасць: за тры летнія месяцы аб'ёмы яго вытворчасці павялічваюцца ў 5 разоў, гэта амаль 50% ад гадавых продажаў. Акрамя таго, запатрабаваны і іншыя салодкія напоі прадпрыемства. 23,5% выраблена піва прадаецца ў гандлёвых сетках Мінска, пасля яго на другім месцы па распаўсюджанасці — Гродзенская вобласць, родныя рэгіён прадпрыемства.

Урэшце зразумела, што, калі нават прыйдзецца пабегаць па вялікім горадзе пад гарачым сонцам або адпачыць дома ці ў парку, можна заўсёды падмацавацца халоднымі напоямі беларускай вытворчасці. А выбраць нешта асаблівае дапаможа ваш густ.

**Павел САЛАЎЁЎ**


## ОАО «Нафтан»
## РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) ЗА ПРЕДЕЛЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:

| Наименование | Инв. № | Год приобретения | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| Параллелофрез CUCCIOLLO CC3 | 06253217 | 2005 | **3 360 000** |
| Стерилизатор паровой ГК-10-1 | 06253220 | 2006 | **1 320 000** |
| Устройство отсоса Silent | 06253329 | 2009 | **5 280 000** |
| Прибор для сверления отверстий под штифты/TOP SPIN | 06253441 | 2009 | **6 600 000** |
| Тример для обрезки моделей | 06253445 | 2009 | **12 600 000** |
| Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort | 06253471 | 2009 | **39 720 000** |
| Рабочее место зубного техника со встр.с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort | 06253472 | 2009 | **39 720 000** |
| Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort | 06253473 | 2009 | **39 720 000** |
| Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort | 06253474 | 2009 | **39 720 000** |
| Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort | 06253475 | 2009 | **39 720 000** |
| Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort | 06253476 | 2009 | **39 720 000** |
| Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort | 06253477 | 2009 | **39 720 000** |
| Горелка паяльная/MULTIPLEX | 06253480 | 2009 | **3 720 000** |
| Горелка паяльная/MULTIPLEX | 06253481 | 2009 | **3 720 000** |
| Аппарат для электролитической полировки модели/ELTROPOL SL | 06253529 | 2009 | **16 680 000** |
| Аппарат для электролитической полировки модели/ELTROPOL SL | 06253530 | 2009 | **16 680 000** |
| Аппарат для электролитической полировки модели/ELTROPOL SL | 06253531 | 2009 | **16 680 000** |
| Устройство полировальное EWL 80 (WP-Ex 2000) | 06253532 | 2009 | **30 120 000** |
| Устройство отсоса Silent | 06253546 | 2009 | **6 960 000** |
| Устройство отсоса Silent | 06253547 | 2009 | **6 960 000** |
| Устройство отсоса Silent | 06253548 | 2009 | **6 960 000** |
| Аппарат для точечной сварки и пайки с компл./TRIPLA 6E | 06273482 | 2009 | **12 840 000** |
| Пресс гидравлический | 06273501 | 2009 | **3 720 000** |
| Пресс гидравлический | 06273502 | 2009 | **3 720 000** |

**<u>Состояние удовлетворительное.</u>**

**Предложения принимаются по адресу:**
**211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 6 августа 2015 года с пометкой на конверте «Реализация неликвидов. Экспорт медтехники».**
**Извещения на проведение конкурса размещены на сайте www.naftan.by.**
**Контактные телефоны:**
**8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, 8(0214) 59-88-01, 8 (033) 398 07 67.**



## ИЗМЕНЕНИЯ
В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,**

**опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. №16 строительство 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – Оршанская – Орловская – Сморговский тракт г. Минск:**
"...Стоимость 1 кв.м квартиры, общей площадью **94,16** кв.м на 3 этаже составляет **1 200** (одна тысяча двести) **долларов США** для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.»
**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704, тел. 8 (017) 306-20-90 ПН-ПТ (9.00–18.00, обед 13.00–14.00).**

УНП 101019973



## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
**Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»**

**Застройщик** – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 №190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 399-53-94.

**Режим работы** – 8.45 – 18.00, обед 13.00 – 14.00 пятница 8.45-16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Проектом предусмотрено строительство объекта «Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланкавыд» по ул. Я. Мавра, 32а» (встроенные помещения).

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства 15 (пятнадцать) офисов с отдельными входами с открытой террасы.

Цена 1 кв. метра общей площади офиса на дату опубликования проектной декларации при строительстве офисов площадью более 100,0 кв.м. (№ 1 – 129,0 кв.м; № 2 – 125,27 кв.м; № 3 – 144,44 кв.м; № 5 – 144,9 кв.м; № 6 – 126,6 кв.м; № 13 – 107,27 кв.м) составляет **23 250 000** белорусских рублей.

Цена 1 кв. метра общей площади офиса на дату опубликования проектной декларации при строительстве офисов площадью до 100,0 кв.м. (№ 4 – 95,96 кв.м; № 7 – 88,33 кв.м; № 8 – 83,78 кв.м; № 9 – 72,44 кв.м; № 10 – 66,91 кв.м; № 11 – 63,68 кв.м; № 12 – 60,61 кв.м; № 14 – 64,27 кв.м; № 15 – 57,09 кв.м) составляет **24 025 000** белорусских рублей.

Предполагаемый срок ввода – сентябрь 2015 года.

С планировками офисов и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 101, тел. 399-53-94 .

<u>Для заключения договора необходимо:</u>

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) для заключения договора;

- оплата 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 3 банковских дней с даты получения договора.

Указанная в настоящей проектной декларации цена 1 кв.м общей площади офисов и их количество считаются действительными до момента опубликования новой декларации.